# *КУЛЬТУРОЛОГИЯ*

**УДК 316.7**

## НАРМАТЫЎНАЯ ВІРТУАЛЬНАСЦЬ ЯК СКЛАДНІК ПРАЦЭСУ ІНКУЛЬТУРАЦЫІ

*А.Д. КРЫВАЛАП*
*(Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*Разглядаецца абгрунтаванне правамернасці выкарыстання тэрміна «нарматыўная віртуальнасць» у кантэксце практыкі засваення сацыяльна-культурных нормаў у працэсе канструявання культурнай ідэнтычнасці. Тэрмін «нарматыўная віртуальнасць» разглядаецца ў кантэксце новага сучаснага разумення віртуальнасці. Праблему ўзнікнення і рэгулявання нормаў аўтар аналізуе ў межах падыходу М. Фуко і яго разумення нарматыўнасці. У дачыненні да новых медыя абгрунтоўваецца наяўнасць лакуны ў разуменні і выкарыстанні цэнтральнага для дадзенага артыкула тэрміна. Паказаны наяўныя абмежаванні выкарыстання нарматыўнай віртуальнасці для вывучэння нормаў сеткавага грамадства.*

***Ключавыя словы:*** *нарматыўная віртуальнасць, новыя медыя, спажыванне, ідэнтычнасць.*

**Уводзіны.** Што значыць нармальнасць у выкарыстанні Інтэрнэту сёння?.. Калі мы свядома адмаўляемся ад прысутнасці ў сацыяльных сетках у нашым коле кантактаў, натуральным чынам узнікае пытанне аб нашай нармальнасці. Як гэта не карыстацца facebook, ці быць аматарам кавы і дэсэртаў, але без instagram? Якім чынам і ў выглядзе якіх патрабаванняў мы адчуваем на сабе ціск з боку супольнасцей, у якія ўваходзім?..

Норматворчая дзейнасць як складнік сацыяльнага жыцця з'явілася адначасова з культурай у шырокім сэнсе. Можна сказаць, што сучасны стан культуры прадугледжвае перманентны пошук межаў нармальнасці, а пасля іх знаходжання – пераасэнсаванне гэтых межаў і іх сацыяльна-культурных сэнсаў. Гэты працэс не можа быць завершаны пакуль з'яўляюцца новыя формы культурнай разнастайнасці, іншымі словамі, гэта бясконцы працэс. Напэўна нешта падобнае адбываецца кожны раз, калі ўзнікае класічны канфлікт бацькоў і дзяцей, калі новая генерацыя патрабуе рэвізіі наяўных норм ва ўсіх сферах сацыяльнага жыцця.

Гэты тэкст прысвечаны канцэпту “нарматыўнай віртуальнасці”, разгляду пытання: у якой ступені інкультурацыя патрабуе (ці ў мяккай форме прапаноўвае) ад нас прысутнасці ў віртуальнай прасторы. У якасці працоўнага вызначэння прапануем наступнае: *нарматыўная віртуальнасць* – сукупнасць патрабаванняў і абмежаванняў, якія прагнуць ад асобы прысутнасці ў віртуальнай прасторы, ці ствараецца патрэба быць анлайн. Іншымі словамі, як ствараецца новая норма. Калі не быць у віртуальнай прасторы – гэта выклік грамадскім уяўленням аб прысутнасці ў публічнай прасторы.

**Асноўная частка.** Калі ў акадэмічных тэкстах сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі ўзгадваецца панятак “нормы” і закранаецца гісторыя яго з'яўлення, то следам непазбежна ідуць спасылкі на працы Мішэля Фуко. Зразумела, што гэта невыпадкова, і можна патлумачыць тым, што стварэнне нормаў і кантролю за іх выкананнем для М. Фуко вельмі блізка да крыніцы атрымання ўлады, калі кантроль над фізічнай прасторай з'яўляецца крыніцай улады. У разуменні М. Фуко, гэта адбываецца на мікрафізічным узроўні , калі з дапамогай кантролю і дысцыпліны мы ведаем як трэба нешта рабіць нармальна, а якія дзеянні будуць класіфікаваныя як ненармальныя.

У кнізе «Ненармальныя» М. Фуко разглядае эвалюцыю нарматыўнай сістэмы на розных узроўнях; якім чынам магчыма ідэнтыфікаваць сімптомы ў індывідуальных паводзінах, каб заўважыць пэўную душэўную хваробу. На яго думку, «па-першае, адхіленне гэтых паводзін ад нормаў парадку, адпаведна, якія вызначаюцца на фоне адміністрацыйнай рэгулярнасці, альбо на фоне сямейных абавязкаў, альбо, нарэшце, на фоне сацыяльна-палітычнай нарматыўнасці. Гэтыя адхіленні і вызначаюць паводзіны ў якасці патэнцыйнага сімптому хваробы. Па-другое, сімптаматалагічнай функцыяй паводзін выступае размяшчэнне гэтых адхіленняў на восі адвольнага і міжвольнага» [11, с. 195]. Як вынік падобнай дысцыплінарнай практыкі ўзнікае феномен чалавека, якога немагчыма перавыхаваць; і адным з магчымых тлумачэнняў чаму так, будзе спроба пазначыць яго як ненармальнага, што цягне за сабой неабходнасць ізаляцыі ад грамадства. «Непапраўны» тып чалавека з'яўляецца адначасова з фарміраваннем дысцыплінарных тэхнік, якія ў XVII і XVIII стагоддзях адбываліся ў войску, у школах і майстэрнях, а крыху пазней і ў сем'ях. Новыя працэдуры

вывучкі цела, паводзін, здольнасцяў падымаюць праблему тых, хто ўхіляецца ад гэтай нарматыўнасці, якая ўжо не раўназначная вяршэнству закону» [11, с. 386–387].

Асобным пытаннем для М. Фуко з'яўляецца гісторыя сэксуальнасці як падпарадкавання цела сацыяльным нормам, якія ўзнікаюць у гэтай сувязі. Напрыклад, сацыяльная значнасць шлюбу і абмежавання пазашлюбных кантактаў. Пры гэтым, на яго думку, «характар гэтых рэжымаў не «нарматыўны», а, хутчэй, «саступальны» [3, с. 137], калі забарона ці абмежаванне мае не татальны характар (нельга бо шкодна), а можа быць прымальнай (калі саступіць і пайсці насустрач абставінам). Пры гэтым не ўсё можа быць вызначана агульнапрынятымі законамі, а гэта значыць, што не ўсё магчыма прапісаць і прадугледзець. І ў гэтых абставінах дзейнічае іншы механізм, які Фуко называе “мікрафізікамі ўлады”, калі «дзейнасць забяспечваецца не правам, а тэхнікай, не законам, а нармалізацыяй, не пакараннем, а кантролем» [5, с. 89].

Цікаўнасць дэканструкцыі нарматыўнасці праяўляецца і ў межах гендэрных даследаванняў. На думку Джудзіт Батлер, «гендэр з'яўляецца механізмам, які нармалізуе і натуралізуе паняцці мужчынскага і жаночага, але адначасова ён можа выступаць і ў якасці механізму, з дапамогай якога гэтыя тэрміны падвяргаюцца дэканструкцыі і дэнатуралізацыі. Сапраўды можа атрымацца так, што апарат, прызначаны для сцвярджэння нормы, адначасова будзе падрываць гэты працэс, рабіць нарматыўнае вызначэнне няскончаным» [8].

І гэта набліжае канцэпт нарматыўнасці да праблематыкі канструявання ідэнтычнасці, калі мы не абіраем з гатовых варыянтаў, а ўвесь час працуем над стварэннем свайго ўласнага і непаўторнага. Дарэчы, даследаванне Жаны Чарновай, якое пабудавана на аналізе дыскурсу рэпрэзентацыі нарматыўнай мужчынскай сэксуальнасці ў глянцавых часопісах, завяршаецца падсумаваннем: «Гендэрная ідэалогія біялагічнага дэтэрмінізму, якая вызначае мадэль нарматыўнай сэксуальнасці, увасабляецца ў вобразе «мачо» [12, с. 545]. Усе іншыя тыпы маскуліннасці патрабуюць штодзённага пацверджаня і стварэння.

Канцэпцыя М. Фуко мае не толькі прыхільнікаў, але і крытыкаў. Тут немагчыма не заўважыць працу Нэнсі Фрэйзер, прысвечаную пагрозам нарматыўнай блытаніны. На яе думку, М. Фуко «меў патрэбу ў нарматыўных крытэрыях, каб адрозніць прымальныя формы ўлады ад непрымальных. Пры цяперашнім становішчы спраў бясспрэчныя арыгінальныя і каштоўнасныя аспекты яго даследавання могуць быць няправільна зразуметыя з-за адсутнасці адэкватнай нарматыўнай перспектывы» [10].

Улічваючы небяспеку згубіцца ў пытаннях нарматыўнасці, тым не менш, мы паспрабуем перанесці праблему нарматыўнасці ў віртуальную прастору. Як і з чаго складаецца нарматыўная віртуальнасць? Адказам можа быць перафармуляванае выказванне М. Фуко, якое ўзгадвался вышэй. Нарматыўная віртуальнасць дасяжна для нас не паводле грамадзянскіх правоў, а праз наяўнасць тэхналогій. Прысутнасць у віртуальнай прасторы – гэта не абавязак у адпаведнасці з законам, а нефармальнае патрабаванне. Мы не чакаем пакарання за дзейнасць у віртуальнай прасторы, але пагаджаемся з пастаянным кантролем. Напэўна, гэта працэй магчыма патлумачыць на прыкладзе выкарыстання мабільных тэлефонаў сёння. Няма закону, які б патрабаваў ад нас мяняць тэлефон кожны год, але нешта падштурхоўвае нас да гэтага. Ніхто не прымушае нас да выкарыстання мабільнага інтэрнэту, але правайдэры мабільнай сувязі няўхільна скарачаюць колькасць тарыфных планаў без інтэрнэту. Мы карыстаемся разнастайнымі сэрвісамі і не маем магчымасці адмовіцца ад зменаў ва ўмовах выкарыстання, калі мы пагаджаемся з кантролем за нашай дзейнасцю.

Нарматыўная віртуальнасць ёсць спалучэнне offline і online. Нарматыўная віртуальнасць – гэта наступны крок развіцця «сеткавай сацыяльнасці» [7] ў разуменні Андрэаса Віттэля, калі частка сацыяльнага перанесена ў віртуальную прастору.

Тэрмін «нарматыўная віртуальнасць» мае пэўную гісторыю выкарыстання ў розных дысцыплінах. Вядомы псіхолаг Жан Піажэ ў 1970 годзе ўпершыню прапанаваў тэрмін «нарматыўная віртуальнасць» ва ўводзінах да французскай версіі тэксту «Асноўныя напрамкі даследаванняў сацыяльных і гуманітарных навук». Пры перакладзе на англійскую мову гэтай кнігі [1] нешта скарацілі ці па нейкіх іншых абмежаваннях гэты тэрмін знік. Ж. Піажэ сыходзіць з таго, што «чалавек не ўспрымаецца як дадзены раз і назаўжды ад абсалютнага пачатку, а ўсе праблемы, які тычацца яго дзейнасці, узнікаюць увесь час у зусім новых умовах. Замест таго каб вярнуцца да папярэдне сфармаванага або зададзенага зыходнага стану для ўсіх віртуальных нарматываў, якія вызначаюць чалавечую прыроду, мы знаходзімся ў атачэнні пошуку адказаў на базавыя пытанні чалавецтва: якія фактары вывелі чалавецтва з жывёльнага стану, як узніклі мовы, грамадства, псіхічнае жыццё. Карацей кажучы, стварыць незлічоныя структуры, якія адлюстроўваюць папярэднія веды чалавецтва» [2, с. 12].

Колін Грант звяртае ўвагу, што Жан Піаже прапанаваў тэрмін «нарматыўная віртуальнасць» у сувязі з пераносам цікаўнасці даследчыка на «функцыі сацыяльнага, а не літаратурныя выдумкі» [6, с. 24]. Аднак для нас сёння важна, што гэты панятак мае сваю папярэднюю гісторыю, прычым «даінтэрнэтных» часоў. Тады віртуальнасць практычна была сінонімам фантазіі, выдуманага сусвету ці наўпрост таго, чаго няма ў нашай рэчаіснасці і тым самым з'яўляецца часткай працэсу пабудовы культурнай

ідэнтычнасці. Культурная ідэнтычнасць таксама можа разглядацца як вынік выкарыстання практык нарматыўнасці. І калі «занадта шмат нарматыўнай вагі даравацьу культурнай ідэнтычнасці, то ўзнікне пагроза таго, што яна можа ўзмацніць маргіналізацыю тых, хто ўжо апынуўся ў незайздросным становішчы ў гэтай групе» [4, с. 21]. Але пытанне нарматыўнасці ўвогуле і культурнай ідэнтычнасці вартае асобнага абмеркавання, таму вернемся да нарматыўнай віртуальнасці.

Культурная сітуацыя грамадства спажывання не можа не ўлічваць практыкі індывідуальнага спажывання. Менавіта праз практыку спажывання і выбудоўваецца наша ідэнтычнасць. Культурная ідэнтычнасць можа будавацца як працэсуальная ідэнтычнасць, ці як практыка ў дзеяннях асобы, але не як чарговы вялікі наратыў, здольны аб'яднаць усіх і паўсюль. Штучна створаная ілюзія множнасці выбару падчас спажывання падмяняе магчымасць абіраць нешта больш значнае і прынцыповае ў жыцці. Грамадства спажывання ўздзейнічае на нашыя практыкі спажываннем праз стварэнне новых патрэб. І сфера новых медыя не з'яўляецца выключэннем. У нас няма выбару, бо быць на сувязі, быць online, быць у доступе, карыстацца мабільным інтэрнэтам – гэта амаль што наш абавязак. Тэлефон які можа толькі званіць не цікавіць нас сёння.

Інкультурацыю ў дадзеным кантэксце мы будзем разглядаць як працэс засваення культурных нормаў і прымальных форм практыкі. У гэтым працэсе нас асабліва цікавіць практыка выкарыстання сучасных тэлекамунікацыйных тэхналогій: інтэрнэт, мабільная сувязь і іншае. Не ў сэнсе адметнасцей міжкультурнай камунікацыі ці ўплыву новых тэхналогій на формы і змест камунікацыі. Нас цікавіць: якім чынам фармулююцца і прад'яўляюцца да выканання патрабаванні да выкарыстання ІТ-тэхналогій, але без прымусу.

Базавым дакументам для ідэнтыфікацыі асобы з'яўляецца пашпарт; але ж яго папяровая версія (ці яе скан) не вельмі добра падыходзяць да віртуальнай прасторы. Спробы распрацаваць механізмы дакладнай індэнтыфікацыі карыстальнікаў ў віртуальнай прасторы развіваюцца адначасова з тэхналогіямі доступу. Адна з іх называецца OpenID – гэта тэхналогія, якая дазваляе аўтэнтыфікацыю ў розных сервісах, калі выкарыстоўваецца адзін уліковы запіс, калі няма патрэбы ў чарговы раз рэгістравацца, запамінаць пароль, пацвярджаць сапраўднасць электроннай пошты і інш. Адзін уліковы запіс для доступу да ўсіх сэрвісаў, якія падтрымліваюць гэта стандарт. Зручна і практычна – тут няма пытанняў.

Але падыход можа быць выкарыстаны не толькі для зручнасці карыстальнікаў. Што адбываецца калі тэхналогіі электроннага ўраду (e-gov) атрымоўваюць шырокі распаўсюд?.. Адказам можа быць цікавы вопыт Эстоніі, дзе картка для ідэнтыфікацыі асобы значна больш, чым проста кавалак пластыку з вашым фота і ўзорам подпісу. Дапоўненая чыпамі і пэўнымі ступенямі абароны ад падробкі і несанкцыянаванага выкарыстання, яна дазваляе ўладальніку атрымаць дзяржпаслугі, якія прагнуць верыфікацыі (даведкі, выпіскі, падаткі і іншае). Фактычна, калі вы атрымалі лічбавае пасведчанне асобы (Digi-ID), то пазбаўляецеся ад неабходнасці наведваць натарыуса ці хадзіць па кабінетах, каб атрымаць тую ці іншую даведку. Нас у гэтым эстонскім прыкладзе цікавіць не пытанне захавання бяспекі і ананімнасці анлайн (гэта асобная вялікая тэма), а мяккае прывабліванне грамадзян карыстацца гэтым сэрвісам праз відавочныя перавагі над традыцыйнымі наведваннямі кабінетаў і офісаў. Так, прымусу няма, але выкарыстанне лічбавых сродкаў камунікацыі прываблівае і спакушае. Каб быць сучасным і не адстаць ад жыцця – неабходна атрымаць гэта лічбавае пасведчанне асобы. Іншымі словамі, мець лічбавае пацвярджэнне сваёй віртуальнай асобы ўспрымаецца як норма. Сёння складана ўявіць сабе жыццё без пашпарту, але цяпер усё ідзе да таго, што нам будзе патрэбны электронны «пашпарт» нашай віртуальнай асобы. І нарматыўную віртуальнасць можна разглядаць як працэс, як рух у дадзеным кірунку.

**Заключэнне.** Як падсумаванне, адзначым наступнае. Выкарыстанне тэрміна «нарматыўная віртуальнасць» дазваляе інакш разглядаць сітуацыю развіцця новых інфармацыйных тэхналогій. Мы дапаўняем псіхалагічны тэрмін «нарматыўная віртуальнасць» сучасным полікультурным кантэкстам новых медыя. Віртуальнасць пагрозы значыць не толькі яе нематэрыяльны і верагодносны характар, але і адсылае нас да існавання іншай рэальнасці, якая мае патэнцыял моцнага ўздзеяння на ўсе віды рэальнасці. Гэта тое, што М. Кастэльс называў «культурай рэальнай віртуальнасці, дзе выдуманы свет з'яўляецца прыдумкай пад час свайго стварэння» [9, с. 353]. Практыкі кантролю за выкарыстаннем «мікрафізікі ўлады» сведчаць пра іншы, новы характар выкарыстання віртуальнай нарматыўнасці: не праз забарону і абмежаванне, а праз кантроль. Паняцце «нарматыўная віртуальнасць» уключае ў сабе і тое, які выгляд мы мусім мець у вачах Іншых у віртуальнай прасторы.

ЛИТЕРАТУРА

1. Main trends of research in the social and human sciences, pt. 1 : The Social sciences / P. de Bie [et al.]. – Paris : The Hague, Mouton, – 1970. – 819 c.

2. Tendances principales de la recherche dans les sciences sociales et humaines, pt. 1 : Sciences sociales / P. de Bie [et al.]. – Paris : The Hague, Mouton, – 1970. – 987 с.
3. Фуко, М. История сексуальности III : забота о себе / М. Фуко. – Киев : Дух и Литера, – 1998. – 228 с.
4. Fierlbeck, K. The Ambivalent Potential of Cultural Identity / K. Fierlbeck // Canadian Journal of Political Science. – 1996. – № 29 (1). – С. 3–22.
5. Foucault, M. The History of Sexuality, Vol. 1: An Introduction / M. Foucault. – New York : Pantheon Books, – 1990. – 168 с.
6. Grant, C.B. Theory of complex communication / C.B. Grant // Revista Ação Ergonômica. – 2011. – № 3 (1). – С. 21–37.
7. Wittel, A. Toward a Network Sociality / A. Wittel // Theory, Culture & Society. – 2001. – № 6 (18). – С. 51–76.
8. Батлер, Д. Гендерное регулирование / Д. Батлер // Неприкосновенный запас. – 2011.– № 2 (76).
9. Кастельс, М. Информационная эпоха: экономика, общество и культура / М. Кастельс. – М. : ГУ ВШЭ, 2000. – 608 с.
10. Фрейзер, Н. Фуко о современной власти: эмпирические прозрения и нормативная путаница / Н. Фрейзер // Неприкосновенный запас. – 2013. – № 2 (88).
11. Фуко, М. Ненормальные : курс лекций, прочитанных в Коллеж де Франс в 1974–1975 учебном году / М. Фуко. – СПб. : Наука, 2005. – 432 с.
12. Чернова, Ж. Нормативная мужская сексуальность: (ре)презентации в медиадискурсе / Ж. Чернова. – СПб. : Д. Буланин, 2002. – С. 527–545

*Поступила 04.05.2017*

## NORMATIVE VIRTUALITY AS AN ELEMENT OF THE SOCIALIZATION PROCESS

***A. KRIVOLAP***

*The article is devoted to the substantiation of the legitimacy of using the term "normative virtuality" in the context of the practice of establishing social and cultural norms in the process of constructing cultural identity. The term J. Piaget proposed is considered in the context of a new modern understanding of virtuality. Also, the problem of the origin and regulation of norms was considered in the framework of M. Foucault's approach and his understanding of normativity. The existence of a lacuna in understanding and using the term central for this article, as applied to new media is justified. Shows the existing limitations of applying normative virtuality to study the rules of the network society.*

***Keywords:*** *normative virtuality, newmedia, consumption, identity.*